# ЗМЕСТ

ГОД 1409 . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Полацка-ноўгарадскае памежжа. *24 кастрычніка* . . . . . . . . . . . 3
Двор Былічаў. *Дзяды*. . . . . . . . . . 23
Троцкі замак. *Дзяды* . . . . . . . . . . 45
Хата шаптухі. *Лістапад* . . . . . . . . 71
Берасцейскі замак. *Дамова* . . . . . . 92
Мальбарк. *8 снежня* . . . . . . . . . 111
Двор Рось. *Каляды* . . . . . . . . . . 125

ГОД 1410 . . . . . . . . . . . . . . . . 149
Смаленск. *Вадохрышча* . . . . . . . . 149
Нёманская іярдань . . . . . . . . . . . 160
Градчаны. *15 лютага* . . . . . . . . . 172
Мальбарк. *25 лютага* . . . . . . . . . 186
Двор Былічы. *Наезд* . . . . . . . . . 194
Ваўкавыск. *Вербная нядзеля* . . . . . 209
Кежмарк. *7 красавіка*. . . . . . . . . 228
Берасце. *20 красавіка*. . . . . . . . . 244
Двор Рось. *Заручыны* . . . . . . . . . 255
Горадня – возера Любень. *Паход*. . . . 270

Грунвальдскія ўзгоркі. *15 ліпеня* . . . . 283
Мальбарк. *Аблога* . . . . . . . . . . 319

ГОД 1413 . . . . . . . . . . . . . . 336
Гародла над Бугам. *2 кастрычніка* . . . 336

ЭПІЛОГ. . . . . . . . . . . . . . . . 355
Курган над Лабай . . . . . . . . . . 355
Рака Святая . . . . . . . . . . . . . 364

*ТЛУМАЧЭННІ* . . . . . . . . . . . . 373

# ГОД 1409

**Полацка-ноўгарадскае памежжа.**
***24 кастрычніка***

З траўня месяца, калі паўстала Жамойць і пачалася вайна з Тэўтонскім ордэнам, вось ужо без нечага палову года Андрэй Іллініч быў з сотняй у раз'ездах, не сыходзіў з каня. Увесь ясны дзень праводзілі ў сёдлах, пакуль сонца не заходзіла ці коні не падалі. А калі падалі, на другіх сядалі. Памаліцца, здаралася, не было калі, паесці цёплага іншым днём не выпадала. Увечары да саломы, да гунькі раскірэкамі ішлі. Кінешся, накрыешся гунькай, павекі зліпнуцца – а ўжо ранак, зноў на каня, астрогі ў бок; лес, дарога, гразь, пыл, дождж, спякота, смага. Ва ўсе бакі кідалі, куды толькі не пасылалі, дзе толькі не пабываў. У сталіцу крыжацкую Мальбарк ездзілі. На Падолле князю Івану Жэдзевіду вазілі ліст – месяц пракалыхаліся ў сёдлах, спякліся, ссохлі пад сонцам. Князя Вітаўта ў Ленчыцу на сустрэчу з каралём Ягайлам суправаджалі – зноў тры тыдні бяззлазна. З Ленчыцы вярнуліся, адразу вялікі князь выправіў на Ноўгарадскае памеж-

жа – Сямёна Альгердавіча сустрэць. Сустрэлі, праводзілі ў Трокі. Князь Сямён з князем Вітаўтам зачыніліся, паўдня прагаварылі – і ў зваротны шлях. Выслалі праводзіць. Цяпер дайсці да мяжы, а там князь сам паскача.

Семёна Альгердавіча ахоўваць не тое што князя Вітаўта. У таго гон шалёны, бесперапынны галоп, у вушах свішча; сам не адпачывае і другім не дае; усё не церпіцца, усё справы, кожная хвіліна нібы з золата – баіцца згубіць. Князь Сямён не спяшаецца: дарога ў Вялікі Ноўгарад далёкая, дзень не выгадаеш, а гадзіна нічога не вырашае. Спакойна рысіць. Цішыня. Коні навучаны – самі трымаюць строй. Сотня заціхла, кожны ў свае думы пагрузіўся, суседу словам не дакучае, ды і пра што размаўляць: усё абгаворана, усё за пяць месяцаў уздоўж і ўпоперак абмеркавалі – не дачакацца, калі распусцяць па дварах на зімовае сядзенне.

Заціхла сотня, у думы акунулася, а думы мала ў каго вясёлыя. Пра што думае баярын на службе? Аб кепскім жыцці, дрэннай долі, убогім лёсе. Служы, служы, а ў падзяку – дулю. За пяць гадоў усяго і выслужыў дзве вёсачкі – адну ў тры, другую ў пяць двароў. Таму што веры грэчаскай, не лацінскай. Хто лацінскай, таму хутка надаюць і дораць. А хто яны? Хто раней крыжа не насіў, на Зніча маліўся, зараз яны ўсе ў пашане, павазе, сіле. Божа, вось Неміровічы... Ці даўно стары Нямір ззаду бацькі ў паходах трымаўся – зараз полацкі намеснік, у былым княжым палацы сядзіць, загадвае, над старажытнымі полацкімі родамі ўзвышаны.

Ды што баяры! Князёў прынізілі, павыганялі з наседжаных месцаў. Ужо які Сямён Альгердавіч – лепшы вайскаводзец на ўсёй Літве, Русі і Жамойці, у ніводнай бітве не саступіў, ва ўсіх перамог, а ва ўдзел атрымаў Амсціслаўскае княства. А яно парубежнае. Хто Смаленск ваюе, той амсціслаўцаў топча, і смаляне топчуць. Але мала, што княства беднае людзьмі, няпроста сярэднюю харугву склікаць, дык адаслалі і самога князя Сямёна прэч з вачэй у Вялікі Ноўгарад, намеснікам. Можа, ён і Вялікі, ды за рэкамі і лясамі ляжыць, два тыдні гону, два месяцы абозы ідуць. Вось вайна навісла, адразу прыгадалі – трэба Амсціслаўскага гукнуць, ён і ноўгарадцаў прывядзе, яго любяць.

Чаму ж яму Кіеў не далі адпаведна заслугам, розуму і крыві, ці Полацак, ці Віцебск, ці Берасце? Таму што веры на лацінскую не змяніў, падобна Ягайлу і Вітаўту. А Сямён – родны брат караля Ягайлы, у яго больш правоў на віленскі пасад, чым у князя Вітаўта.

А вось калі б яму, падумаў Андрэй, зрабілі прапанову, ну хто, ну вялікі князь пазваў бы і выставіў умову: перахрысціся ў веру лацінскую – вялізны будзе табе абшар, як у Кежгайлы ці ў Восціка, згодны? Дарэмнае было б пытанне, Андрэй і хвіліны не разважаў бы, як трэба адказаць. Толькі хто прапануе? З якой прычыны? Ніхто пра яго не згадае, калі шчаслівы выпадак Бог не пашле. Вось так гадамі ў сядле і будзеш бадзяцца, мокнуць пад дажджом, дубець пад сонцам, князёў сус-

тракаць-праводзіць, адвозіць лісты, пакуль не праб‘юць лоб чаканом у якой-небудзь сутычцы ці не праніжуць стралой. Дзевяцёх згубіла сотня за гэта лета, хоць ні з кім і не біліся. У Коўна ляцелі з лістамі, вось так, як тут, лес абкружаў. Глухія сцены з абодвух бакоў – пушча, вечная глухмень. Час перад захадам, цішыня, раптам – жыг! жыг! – і двое валяцца з сёдлаў, у спінах стрэлы. Памінай як звалі! Хто страляў? Ці немцы ў засадзе сядзелі? Ці жамойты падкупленыя? А на Падоллі – сонца, духата, пекла, у кашулі горача, а тры дні кальчугі не здымалі: па пятах утрая большы варожы аддзел ішоў. Бой не прымеш – пасякуць. У жалезе тры дні і скакалі, варыліся, як ракі ў гаршку. Таксама пяцёх не далічыліся. Так усё жыццё можна прашлындаць.

Дарога, бясконцая скачка, ачмурэлая галава. Пяць месяцаў пранесліся хутчэй за тыдзень. Выпраўляліся – зелянела, а ўжо лісце падае, восеньскай прэллю дыхае лес, і нічога ў памяці – толькі конская грыва, ззаду храп, тупат, іржанне коней, ды сябра Мішка Расевіч побач. Выпадак бы Бог паслаў, вось пра што трэба памаліцца.

Расевічу лепш; яму не бяда: адзіны сын; бацькаўшчына ўся яму дастанецца. Ну, сёстрам выдзеліць пасаг – невялікія страты. А іх, Ільлінічаў, шасцёра братоў. Падзялі бацькаўшчыну на шэсць кавалкаў – што атрымаеш? Хату зрубіць, хлеў, свіран, а зямлі – хіба толькі курам і хопіць. Бацька і думаць не стаў: старэйшым па палове, а малодшым – вось меч, вось конь – выслужвайце, хлопцы.

і ўся шумлівая дружына выкаціла за вароты. Агонь згас, стары паклікаў усіх на працяг застолля – цудоўнае імгненне блізкасці абарвалася.

Назаўтра Андрэй развітаўся з Расевічамі.

## ГОД 1410

### Смаленск. *Вадохрышча*

На куццю намеснік Васіль Барэйкавіч у вялікім пакоі палаца варажыў, як варажыў у гэты час увесь Смаленск. Утаропіўшыся на сэрцападобны агеньчык свечкі, Барэйкавіч чакаў з'яўлення ў полымі нейкага знака, які ўсё праясніць і здыме трывогу. Свечка аплывала, нарэшце агеньчык затрапятаў сінімі промнямі ў лужыцы воску. Тады Барэйкавіч запаліў новую свечку. Звычная маркота ахапіла яго. Намеснік ведаў прычыну сваёй маркоты – ён нудзіўся ў Смаленску, за шэсць гадоў намесніцтва горад стаміў яго.

Цяпер ужо рэдка здараліся дні, калі Барэйкавіч, уваходзячы ў гэты пакой, дзівіўся: няўжо гэта ён, Васіль Барэйкавіч, ходзіць па тых самых масніцах, па якіх смаленскія князі хадзілі, глядзіць у тыя ж самыя вокны, што і яны, прымае ўдзельных князёў у тым жа пакоі, дзе яны іх прымалі. Але вось нікога з іх няма на свеце, а ён прыбыў з Ашмянаў у Смаленск, пастаўлены сюды Вітаўтам трымаць парадак.

Так, казаў Барэйкавіч сабе, не падмануўся ён у князі Вітаўце, калі цярпеў разам з ім усе бедствы выгнання, уцёкаў, рызыку сутычак. Большай узнагароды князь даць не можа. Дзе намеснічае? У старажытным горадзе, у вялізным княстве, там, дзе цесць Вітаўта ўладарыў, дзе ва ўдзелах Рурыкавічы сядзяць і вымушаны яго слухаць.

А што Рурыкавічы? Прыгнуліся пад татарамі ўсе Рурыкавічы. Любяць сябе падвысіць, старажытнасцю роду ўласную слабасць засланіць. Дык і ён за іх нікольки не ніжэйшы. І бацька, і дзед яго, і прашчур зваліся Барэйкі. І былі Барэйкі яцвяжскія князі, свае дружыны мелі, і свае канюшыя падводзілі ім коней. І саромецца яцвягам няма падставы, з чатырох бакоў іх высякалі захопнікі, але не скарылі, і яцвягі даніну ворагу не давалі, як Рурыкавічы татарам паўтараста гадоў. Не зніклі Барэйкі, і пры ім род не занікне. Ці даўно ашмянскае намесніцтва атрымаў, а цяпер Смаленск ад імя князя Вітаўта трымае. Валадарылі тут смаленскія князі, цяпер яцвяжскага роду князь сядзіць. Вядома, Барэйкі не Гедзімінавай былі моцы, але вось Вяземскаму ці Дарагабужскаму ў гэтым палацы ніколі не сесці, ім сюды толькі па справе можна ўвайсці, калі паклічуць.

Усё так, але клопату патрабуе смаленскае намесніцтва. Едзеш па горадзе і чытаеш у вачах: «Пацерпім, пакуль ціха, а ледзь што – падымемся!» Барэйкавіч тады злосна думаў: недабіткі, па-воўчы зыркаюць, толькі і чакай, калі ў глотку ўгрызуцца. Ужо было так – на-

месніка сякерамі забілі і са сцяны ў роў скінулі. Тры гады Вітаўт Смаленск ваяваў, дарага каштавала гэтае задушэнне – тысячы сваіх людзей паклалі пад сценамі, шмат галоў тут мусілі знесці, каб астатнія скарыліся. Усё ў Смаленску зыбкае. Вось каляды, народ гуляе, увечары будучыню гадаюць. Зразумела, пра што дзеўкі гадаюць. Але што князі Вяземскі і Дарагабужскі выварожваюць, сходзячыся разам? Чаго ім ва ўдзелах сваіх не сядзіцца, якая патрэба ў Смаленск прывяла? Абодвух аднačасна? Тугу сваю пахмельную разганяць у Саборнай царкве?

Не адмахнешся ад думак, калі было падслухана кароткае, кепскае слова «ад'езд». Цяпер разважай, што Вяземскі і Міцька Дарагабужскі вырашылі, у якую бяду іхны шэпт можа адліцца. Раптам надумалі князя Фёдара на бацькоўскае месца прызваць, як дзевяць гадоў назад князя Юр'я прызвалі? Ці самі мяркуюць ад'ехаць у Маскву, да Васіля Дзмітравіча на службу, а то і зусім адламіцца да яго з землямі, баярамі, людзьмі, пасошчынай? Што станецца? Вайна з Масквой. Хіба пагодзіцца князь Вітаўт са стратай Вязьмы? Але спытае: хто праваронію? А вось яна, варона, – намеснік смаленскі. Пэўна, састарэў – час на печ.

Ну і што рабіць, думаў Барэйкавіч, маркотна гледзячы на аганёк. Не да часу гэты клопат. Загадана кармы везці ў Горадню, харугвы трэба трымаць напагатове. І раптам – ад'езд. Раптам харугвы ў адваротны бок вырушаць? Ці прыйдзецца сюды палкі прыводзіць. «Не,

мроіцца мне, – падумаў Барэйкавіч, – мрояцца страхі. Калі Леў з Міцькам ад'едуць – няхай, малая бяда, толькі б без смуты».

Намеснік Васіль даседзеў да поўначы і, стомлены разважаннямі, хутка заснуў.

Ранкам ён загадаў сотніку, каб адшукалі і запрасілі да абеду абодвух князёў. Маючы час, Барэйкавіч з купкай аховы паехаў да Дняпра паглядзець, як ачышчаюцца ў іардані калядоўшчыкі.

У горадзе званілі званы. Папы Саборнай царквы вялі да Дняпра хрэсны ход – грамаду шчырых вернікаў і цікаўных. Барэйкавіч з аховай прысталі ў хвост натоўпу. Увесь бераг Дняпра ў абодва бакі быў пабіты палонкамі, каля іх служылі вадохрышча святары.

Паехалі на Смядынь да Барысаглебскага манастыра. Тут манахі чарпаламі налівалі асвячоную ваду ў глякі. Доўгая чарга моўчкі мерзла: шануючы свята, ніхто нават не таптаўся. «Узялі тут сілу чарняцы, – думаў намеснік, – во як людзі за рачной вадой пакорліва стаяць».

Вярнуліся назад, да Дняпроўскага спуску. Асабліва скучваўся народ ля апошняй праламкі – у гэтай іардані будуць ачышчацца калядоўшчыкі. Іх сабралася з паўсотні. Ужо першыя раздзяваліся дагала і, закрываючы рукамі сарамату, беглі да праламкі. Гледачоў ахапіла шалёная весялосць. Паскакаўшы на беражку, голыя мужыкі і хлопцы з віскам вухнулі ў ледзяную купель, прыселі ў вадзе па горла, і праз імгненне палезлі з іардані, саслізгваючы